# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*У. А. ЖЫЛКО*

## АКСІЯЛАГІЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ ЭТНАКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ У ТВОРЧАСЦІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

*Аналізуюцца аксіялагічныя дамінанты этнакультуры беларусаў, выяўленыя ў творчасці Яна Баршчэўскага. Адзначаецца хрысціянскі характар большасці каштоўнасных катэгорый, што звязана з непасрэдным уплывам хрысціянства на асобу аўтара як суб'екта этнакультуры, на фарміраванне культурнага асяроддзя беларускага этнасу, каштоўнаснага зместу этнічнай культуры ў цэлым.*

Праблема этнаспецыфічных кампанентаў культуры сёння займае вядучае месца ў галіне культуралагічных дысцыплін. Гэта тлумачыцца тым, што яна ахоплівае фундаментальныя аспекты функцыянавання этнасу – найперш тыя, што звязаны з яго самаідэнтыфікацыяй. Відаць, гэта тычыцца і беларускага этнасу, для якога застаюцца ў пэўнай ступені актуальнымі праблемы беларускай ідэі, беларускага шляху ці, прынамсі, нацыянальных інтарэсаў – г. зн. праблемы, невырашальныя без аналізу спецыфікі беларускага этнасу. Асэнсаванне і тэарэтычнае абгрунтаванне шматлікіх аспектаў этнакультуры ў навуковай супольнасці шырока прадстаўлена работамі С. Аруцюнава [1], Ю. Брамлея [3], П. Ігнатовіча [4], Ю. Чарняўскай [6, 7]. Таму падаецца тэарэтычна апраўданым зварот да выяўлення і грунтоўнага аналізу этнакультурных кампанентаў на матэрыяле твораў мастацкай літаратуры. Асоба Яна Баршчэўскага ў гэтым дачыненні выступае надзвычай знакавай, паколькі ў сваёй творчасці пісьменніку ўдалося зафіксаваць багаты пласт этнакультурных характарыстык. *Мэтай* дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне аксіялагічнага зместу творчай спадчыны Я. Баршчэўскага.

У якасці дамінуючага элемента этнакультуры, адлюстраванага ў творчасці Я. Баршчэўскага, выступаюць этнічныя каштоўнасці, пад якімі мы будзем разумець, падзяляючы пазіцыю даследчыцы этнічнай галіны культуралогіі Ю. В. Чарняўскай, сукупнасць жыццёвых арыенціраў, ідэалаў, узораў, традыцый, найбольш адметных рыс характару прадстаўнікоў дадзенага этнасу, а таксама некаторых іншых параметраў, якія самімі этнафорамі лічацца найбольш значнымі для самазахавання і развіцця свайго народа і для рэалізацыі яго прызначэння ў сусветнай гісторыі і культуры [6, с.116]. Аналіз літаратурнай спадчыны Яна Баршчэўскага дае магчымасць выявіць этнакультурныя дамінанты яго творчасці.

Каштоўнасці з'яўляюцца квінтэсенцыяй этнічнай культуры, складаюць яе душу, ядро, злучаюць практычны і духоўны вопыт і адносіны чалавека да свету і да іншых людзей. На аснове вылучаных каштоўнасцей можна сканструяваць змест усёй этнічнай культуры, выявіць яе цэласны вобраз.

Сюжэты для сваіх апавяданняў Я. Баршчэўскі чэрпаў з багатай крыніцы народных беларускіх паданняў і легендаў, якія ён збіраў на Віцебшчыне амаль усё жыццё, таму абсалютна заканамерным падаецца выкарыстанне ім элементаў традыцыйнай культуры ў сваіх літаратурных творах. Асабліва ў гэтым плане вызначаецца зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» [2]. Варта падкрэсліць, што далучэнне да любой культуры адбываецца менавіта праз вуснапаэтычную творчасць народа і фальклор з'яўляецца адным са сродкаў выяўлення яго ўнутранага свету. Сам пісьменнік так гаворыць пра каштоўнасць вуснай народнай творчасці: «У народных паданнях

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сустракаў пачуццё і праўду, адчуваў у іх мудрасць і малітву цэлага народа…» [2, с.198]. Ян Баршчэўскі не проста схематычна запазычваў сюжэты фальклорных твораў з духоўнай скарбонкі беларускага народа, а рабіў гэта мэтанакіравана, спрабуючы адшукаць у легендах, паданнях рацыянальнае зерне, дзякуючы якому яны захаваліся на працягу стагоддзяў і нават сёння выступаюць у якасці духоўнага арыенціра. У апавяданнях зборніка побач з багатым выкарыстаннем матываў беларускіх народных вераванняў і паданняў шырокая воля даецца творчай фантазіі аўтара, якая не толькі звязвае ў адно паасобныя элементы, але надае ўсяму твору пэўны кірунак і індывідуальны каларыт. Такім чынам, асноўнымі транслятарамі і захавальнікамі каштоўнаснага зместу этнічнай культуры ў творы выступаюць легенды і паданні, сюжэты якіх перанятыя з фальклору і арыгінальна апрацаваныя аўтарам.

У вуснай народнай творчасці адлюстроўваюцца працоўны вопыт і гісторыя, эстэтычныя і маральныя ідэалы, мары і спадзяванні, захоўваюцца і транслiруюцца мадэлі ідэальнага жыцця беларусаў. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што фальклорны матэрыял змяшчае ў сваёй аснове каштоўнасны змест этнічнай культуры, дае выдатную магчымасць вылучыць аксіялагічныя дамінанты культуры беларускага этнасу. Перш чым перайсці да іх разгляду, неабходна акрэсліць пераважна хрысціянска-народны характар большасці твораў Яна Баршчэўскага, што тлумачыцца найперш уплывам тэасофскай адукацыі пісьменніка, атрыманай у езуіцкай акадэміі, а таксама арганічным перапляценнем біблейскага, рэлігійнага з народным, часам нават дахрысціянскім, у межах вуснапаэтычнай традыцыі. Пад уплывам царквы, хрысціянскага вучэння рэлігійны элемент сапраўды пранікаў у сферу вобразных народных уяўленняў, надаючы пэўную афарбоўку рэалістычнаму мысленню народа, сам жа пісьменнік, відавочна, значна ўзмацняе яго ў творы «Шляхціц Завальня…». Гэты момант знаходзіцца ў шчыльнай сувязі з аўтарскім светаадчуваннем. Менавіта на светапоглядным фундаменце хрысціянства ўзніклі традыцыйная беларуская культура, літаратура, філасофія.

Фальклор з’яўляецца выдатным захавальнікам этнічных каштоўнасцей беларусаў, пераважная большасць скарбаў прадстаўлена каштоўнасцямі духоўнымі. Прааналізаваўшы творчасць Яна Баршчэўскага на выяўленне аксіялагічных дамінантаў этнічнай культуры, можна сказаць, што сярод іх у якасці цэнтральнай і вызначальнай для ўсіх астатніх выступае Бог. Вера ў Бога з’яўляецца сімвалам вечнасці, каштоўнасным арыенцірам, своеасаблівым пунктам адліку, вакол якога працякае жыццё беларуса. Паводле М. І. Крукоўскага, ідэя Бога мае ўніверсальны характар, і ў ёй, нібы ў вяршыні піраміды, канцэнтруюцца як законы прыроды, так і ўсе ідэалы і духоўныя каштоўнасці чалавецтва… [5, с.17]. Просты селянін у сваім успрыманні сусвету кіруецца боскім прадвызначэннем і лічыць, што ўсё ў жыцці, як добрае, так і дрэннае, ёсць Божая воля. Такое фатальнае стаўленне да жыцця характэрна для многіх герояў твора Я. Баршчэўскага, напрыклад сляпога Францішкі:

*«Летам, калі я чую гром, што скаланае ўсю зямлю, думаю пра ўсемагутнасць Творцы і пра Ягоную міласэрнасць. Няхай будзе Яго воля. Наша будучыня – у Яго руках»* [2, с.245].

Сам Ян Баршчэўскі неаднаразова падкрэслівае вызначальную ролю Бога ў каштоўнасным змесце ўсяго існага. Да прыкладу, вершаваныя радкі, уведзеныя ў празаічны тэкст «Шляхціца Завальні…» у якасці лірычнага адступлення:

Божа! Колькі падзякі Табе ў прыродзе!
Загадаеш, і краскай вясна завітае,
Загадаеш, як слотная восень праходзіць
І ў вырай вандроўнае птаства злятае.

А даброты Тваё ўсе стварэнні зазналі,
Там, дзе моры пяскоў пад адвечнай спякотай,
Там, дзе моры ільдоў назаўсёды паўсталі,
Ёсць апека твая над найменшай істотай [2, с.252].

Зусім не выпадкова, што большасць вылучаных намі аксіялагем этнічнай культуры, адлюстраваных у творы, маюць у сваёй аснове трывалы хрысціянскі элемент, пераважная большасць з іх носіць характар біблейскай запаведзі. Не прыходзіцца аспрэчваць тое, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтральнай каштоўнасцю хрысціянства, яго вызначальным пастулатам з'яўляецца любоў ва ўсіх яе праявах. Менавіта *любоў і літасць да бліжняга* выступаюць у творы аб'ядноўваючым фактарам, трывалым падмуркам чалавечага жыцця, каштоўнаснай першаасновай. З клопатам і любоўю да бліжняга шляхціц Завальня запальвае свечку ў непагадзь:

*«Пан Завальня меў звычай рабіць гэта кожную завейную ноч ужо таму, што жыла ў ягоным хрысціянскім сэрцы любоў да бліжняга, і ён рады быў заўсёды гасцям, каб з імі пагаварыць і паслухаць іхнія гісторыі»* [2, с.93].

Пацверджаннем таго, што любоў да бліжняга выступае аксіялагічнай дамінантай беларускай этнічнай культуры, можа паслужыць частае прыгадванне ў творы народных выразаў адпаведнага зместу: «Блізкім сваім дапамагаць – абавязак хрысціянскі» [2, с.162], «Лепей жыць з Богам» [2, с.118]. Хрысціянскі пастулат ляжыць у аснове паводзін станоўчых герояў твора, а адмаўленне, адыход ад яго крытыкуюцца аўтарам. У многіх аповесцях грэшнікі караюцца, прычым пакаранне звычайна ўзыходзіць да біблейскага прататыпа: карная роля саранчы, жаб, агню – як праява Боскага гневу. У асноўным героі з народных апавяданняў выпрабоўваюцца на трываласць нячыстай сілай, якая падсцерагае чалавека на кожным кроку, ловячы хвіліны яго слабасці, што здараецца звычайна ў час вялікай бяды. Чалавек, які здолеў перанесці ўсе пакуты і выпрабаванні, не адступіўшыся ад хрысціянскай маралі, тым самым выратоўвае сябе для жыцця вечнага. Так, Марка з апавядання "Ваўкалак" пазбавіў сябе ад ліхога закляцця быць усё жыццё пярэваратнем: пераадолеўшы сваю прагную нянавісць да людзей, ён выратаваў дзіця, якое скраў воўк, ад пэўнай смерці. Спачатку нясцерпна пакутуючы праз людскую несправядлівасць і жорсткасць, урэшце Марка прыходзіць да думкі, што трэба людзям рабіць дабро, не зважаючы ні на што, «бо помста прыніжае чалавечую годнасць да стану жывёлы, а дабрачыннасць і лагоднасць улагоджваюць міласэрнасць Божую» [2, с.133].

Менавіта міласэрнасць, літасцівыя і спагадлівыя адносіны да бліжняга былі асновай запавету, дадзенага бацькамі сыну, калі яны адпускалі юнака Завальню ў вялікі свет у пошуках сваёй долі:

*«Памятай заўсёды такую прыказку: як пасцелеш – так і выспішся. Калі літасцівы Бог дасць табе добры лёс і ўладу над сваімі зямнымі скарбамі – не шкадуй бліжнім, памятаючы, што міласэрныя атрымаюць міласэрнасць і будуць спадчыннікамі Царства Нябеснага»* [2, с.177–178].

Міласэрнасць і вера, якія раптоўна прачнуліся ў помслівай, жорсткай і праз тое пакутнай душы, выратоўваюць кабету Інсекту з апавядання «Драўляны дзядок і кабета Інсекта». Зайздрасць, гнеў і помслівасць у адносінах да людзей ператварылі кабету ў крылатую пачвару, якая шкодзіла і не давала спакойнага жыцця новаму дзедзічу і ўсяму працоўнаму люду маёнтка. Дзякуючы далучэнню кабеты да слова Божага праз штодзённыя малітвы, душа яе ўрэшце атрымала выратаванне і вызваленне ад гневу.

У аснове характэрнай для беларускага этнасу этыкі жыцця ляжаць хрысціянскія запаведзі. Рэлігійна-маральная матывацыя шмат у чым вызначае паводзіны беларуса ў паўсядзённым жыцці, з цягам часу яна сфарміравала асаблівыя адносіны да працы і гаспадарчай дзейнасці ў цэлым. Глыбока аналізуецца ў зборніку такая аксіялагема, уласцівая этнакультуры беларусаў, як *праца*. Праца ў хрысціянскай традыцыі спрадвеку выступала адным з галоўных сродкаў выратавання душы. Сама праца лічылася каштоўнасцю ў тым выпадку, калі яна была блаславёная – гэта значыць з'яўлялася своеасаблівым супрацоўніцтвам з самім Богам, садзейнічала паспяховаму выкананню яго задумы адносна свету і чалавека. Працавітасць лічыцца адной з самых станоўчых і дамінуючых рыс характару беларуса. Аднак, калі праца накіравана на служэнне эгаістычным інтарэсам, на задавальненне грахоўных патрэб, у такім выпадку яна становіцца супрацьлегласцю каштоўнасці.

Спрадвечна беларусы працавалі на зямлі. Традыцыйная культура беларускага этнасу цесна звязана з асаблівасцямі земляробчага цыкла. Фактычна існаванне чалавека і яго дзейнасць вызначаліся працай на зямлі ў пэўны перыяд года. Зямля з'яўляецца своеасаблівым цэнтрам беларускага светаўспрымання, трывалым падмуркам сялянскага жыцця, крыніцай існавання, найгалоўнейшай каштоўнасцю – ад яе наяўнасці і ўрадлівасці залежалі матэрыяльныя і духоўныя даброты працаўніка. На ўзроўні культуры каляндарна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

земляробчага тыпу акцэнт пераносіцца з прагматычнай, матэрыяльнай каштоўнасці жыцця, якую забяспечвала зямля, дзякуючы сваёй урадлівасці, на духоўную каштоўнасць. Уяўленні аб зямлі цесна звязаны з паняццямі роду, Радзімы, краіны, а значыць, роднасці, лучнасці, цеснай еднасці этнічнай супольнасці. Менавіта таму Ян Баршчэўскі неаднаразова падкрэслівае значэнне добрасумленнай працы для шчасця і дабрабыту як простага селяніна, так і прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў. Варта падкрэсліць, што ў творы цалкам захоўваецца спрадвечны звычай беларусаў ставіцца да зямлі, як да жывой істоты, якая патрабуе адпаведных адносін да сябе. «Зямля задаволіць усе патрэбы. На яе павінны звяртаць мы ўсю нашу ўвагу…» – сказаў Завальні адзін з падарожных, апавядаючы пра свае гаспадарчыя клопаты простага селяніна па вясне.

Але не толькі сяляне дбаюць пра зямлю – фізічнай працы не цураюцца і шляхціцы. Узорам руплівага гаспадара можа паслужыць дзядзька Завальні, які ставіць клопат аб зямлі вышэй за іншыя жыццёвыя турботы. За сваю старанную працу ў выніку дзядзька атрымаў падзяку ад князя, прыдбаў уласны кавалак зямлі, пабудаваў дамок і абзавёўся сям'ёй. Клапоціцца пра зямлю і пан Зямельскі з апавядання «Драўляны дзядок і кабета Інсекта»:

*– Гаспадарка, – сказаў ён мне, – вымагае не прыдумак розных, а досведу і руплівасці; хто працуе, таму і Бог дапамагае. <…> Нашы продкі жылі на гэтай зямлі спакойна і заможна. Гаспадару, які славіць Бога, усяго хапае…* [2, с.315].

Адступленне ад біблейскага запавету паважлівых адносін да разумовай працы персаніфікавана ў вобразе шкаляра Люцэфуга, якога ператварылі ў вялізнага прусака. Такім чынам, праца (як фізічная, так і разумовая) для беларуса з'яўляецца найважнейшай каштоўнасцю, адзіна правільным спосабам дасягнення вартага, гарманічнага жыцця.

Апроч таго, што праца выступае асноўным спосабам жыццядзейнасці, яна яшчэ з'яўляецца аб'ядноўваючым элементам паміж чалавекам і прыродай. Аналіз творчасці Яна Баршчэўскага дае падставу сцвярджаць, што ў сваіх апавяданнях пісьменнік выдатна адлюстроўвае каштоўнаснае асэнсаванне беларусамі прыроднага асяроддзя. *Прырода* ў творы выступае не толькі як сфера працоўнай дзейнасці, як захавальніца жыцця чалавека, але і як крыніца натхнення, што паказвае на эстэтычны складнік. Увогуле для этнічнай культуры беларусаў характэрна непадзельнае адзінства маральных і эстэтычных каштоўнасцей, змест якіх надзвычай удала адлюстроўваюць універсаліі народнай канцэпталогіі: хараство і людскасць, якія выдзяляе беларускі даследчык А. У. Рагуля. Дамінуючая каштоўнасная ўстаноўка этнічнай культуры не дапускае супрацьстаяння паміж гэтымі паняццямі. Адзінства названых катэгорый вызначыла крытэрыі якаснай ацэнкі жыцця. Беларускі ідэал не выносіцца за межы чалавечага свету, не бярэцца з трансцэндэнтнага вымярэння, а вырастае з рэальнага жыцця, з навакольнага асяроддзя.

Прагматычнае вымярэнне каштоўнасці прыроды адлюстравана ў творчай спадчыне Я. Баршчэўскага праз выкарыстанне ў творы шэрагу народных прымет, якія дазваляюць уважліваму гаспадару прадбачыць вынікі сваёй працы, засцерагчыся ад памылак, правільна размеркаваць свой час і сілы. Жыццё чалавека ў суладдзі з прыродай спрыяе дабрабыту, уладкаванасці, дасягненню своеасаблівай гармоніі ў жыцці. Назіральнасць чалавека садзейнічае прадуктыўнаму дыялогу з прыродай, менавіта таму большасць прыродных з'яў для гаспадара з'яўляюцца, у нейкай ступені, вешчунамі будучыні. Найбольш яскрава гэта адлюстравана Я. Баршчэўскім праз шэраг прымет, якімі дзеляцца героі адзін з адным. Пан Латышэвіч слушна зазначыў аднойчы пану Сівоху, што *«дасведчаны гаспадар на кожную рэч павінен зважаць. <…> Калі напрыканцы снежня і пачатку студзеня бывае бура і снег глыбокі, дык улетку багата травы на лугах і буйное жыта вырасце на ніве. Гэтая зіма павінна цешыць гаспадара, бо мароз і паўночны вецер пад глыбокім снегам жыта і пшаніцу не вымаразіць»* [2, с.219–220].

Беларусу спрадвеку ўласціва ўспрыманне прыроды як таямнічага свету дзівосаў. Сузіранне гэтага свету натхняе і вызваляе ад панурасці і цяжару штодзённай працы. Герой «Нарыса Паўночнай Беларусі» надзвычай паэтычна малюе краявіды родных мясцін:

*«Там вясна – рай; самыя розныя птушкі, здаецца, збіраюцца з усіх канцоў свету, тысячы розных меладычных, дзікіх і чуллівых галасоў адгукаюцца над вадою па лугах і лясах. <…> Гэтая дзівосная суладнасць і гэты канцэрт прыроды пераносілі мае ўяўленні ў нейкі чарадзейны край»* [2, с.84].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як было адзначана вышэй, галоўнай прыроднай каштоўнасцю лічылася зямля. Архетып зямлі цесна звязаны з культам продкаў. З аднаго боку, продкі лічыліся валадарамі зямлі, з другога – яна была іх вечнай калыскай. Таму зусім не выпадковым з’яўляецца вылучэнне намі ў якасці асобнай аксіялагемы, яскрава адлюстраванай у творчасці Яна Баршчэўскага і адпаведна ўласцівай этнакультуры беларусаў, *паважлівага стаўлення да мінулага, ушанавання продкаў*. Памяць пра мінулае – неад’емная частка жыцця сённяшняга, абавязковы элемент існавання чалавека ў свеце. Так, асуджаючы сляпую прагу да лёгкага абагачэння, якая змушае чалавека пераступіць праз спрадвечныя маральныя ўстаноўкі, пісьменнік у апавяданні «Плачка» згадвае жудасны момант рабавання магілы слаўнага волата: некалькі юнакоў, апантаныя прагай адшукаць скарб, знаходзяць магілу асілка і вырашаюць забраць яго зброю на памяць пра страшную ноч. Патрывожыўшы прах асілка, хлопцы тым самым раззлавалі дух волата, які, небеспадстаўна абурыўшыся, асудзіў іх учынак:

*«Нікчэмныя людзі! Золату і срэбру прадалі вы свае душы. Думаючы адно пра багацце, вы зняважылі прах Героя, які слаўна скончыў тут сваё жыццё. Прыйдзе час падняцца з магіл мёртвым, і вы будзеце зганьбаваныя перад усім светам!»* [2, с.171].

У апавяданні «Валасы, якія крычаць на галаве» пан Сівоха сваім жахлівым аповедам асуджае ганьбаванне памяці продкаў дзеля імкнення задаволіць свае прагматычныя патрэбы. Паслухаўшыся нячыстага духа – шатана ў вобразе сівога старца, пан Генрых вырашае на месцы былых могілак засеяць поле, каб крыжы больш не палохалі і не даводзілі да меланхоліі прыезджых гасцей, а магільныя камяні і капліччку загадвае пусціць на падмурак будучага дома. Безумоўна, гэты ўчынак палярызуе са спрадвечнай народнай мараллю, разыходзіцца з этнічнай каштоўнасцю шанавання продкаў, увогуле, згодна з біблейскім запаветам, зрабіць гэта – значыць узяць на душу вялікі грэх. Менавіта таму падданыя разам з ксяндзом спрабуюць давесці да пана небяспечнасць, памылковасць і бязбожнасць дадзенага рашэння:

*«Такі звычай усюды ў нашым краі: могілкі навідавоку або блізка дарогі, каб людзі, сустракаючы вокам крыжы і магілы, тварылі малітвы за душы тых, хто ўжо заручыўся з зямлёю»* [2, с.230].

Такім чынам, можна сказаць, што спрадвеку беларусы шануюць магілы сваіх продкаў, прычым робяць гэта не толькі дзеля выканання хрысціянскага абавязку, але і дзеля захавання цэласнасці этнасу, заўсёднага адчування роднасці, агульных каранёў і адзінай гісторыі. Да таго ж, калі казаць словамі самога пісьменніка, «мінулае вучыць нас, як жыць сёння».

З аксіялагемай паважлівага стаўлення да мінулага цесна звязана катэгорыя *сям’і* як адной з дамінант этнічнай культуры. Сем’і герояў «Шляхціца Завальні…», хоць і не знаходзяцца ў самым цэнтры аўтарскага аповеда, аднак пэўны акцэнт на іх робіцца. Аб’яўленая хрысціянствам у якасці дамінуючага ўзору манагамная сям’я становіцца цэнтральным апірышчам у жыцці чалавека. Ян Баршчэўскі падкрэслівае важнасць хрысціянскай пазіцыі на прыкладзе шчаслівых сем’яў шляхціца Завальні і яго жонкі Мальгрэты, пана Марагоўскага з дзецьмі. Пра абавязковае шчасце ў сям’і, дзе пануе згода, сведчаць і госці ў сваіх аповедах, якія ўвабралі ў сябе мноства трапных народных мудраслоўяў на гэты конт: *«Хто ажэніцца – той пераменіцца»* [2, с.119], *«Добрая жонка – скарб найдаражэйшы, бо дзе ў хаце каханне ды згода, там і блаславенне Божае»* [2, с.109].

У творчасці Яна Баршчэўскага побач з сям’ёй да аксіялагічных катэгорый этнічнай культуры беларусаў цесна прымыкаюць дамінантныя рысы беларускага нацыянальнага характару, якія маюць этычную афарбоўку і ў сувязі з гэтым могуць разглядацца ў аксіялагічным ключы. Сярод іх найперш варта назваць *гасціннасць, шчодрасць*. Напрыклад, дастаткова прыгадаць адносіны шляхціца Завальні да сваіх гасцей: усе госці знаходзілі ў хаце гаспадара ўтульны прытулак, шчодрую вячэру і душэўную размову. Таксама атрымліваюць грунтоўны аналіз і каштоўнаснае асэнсаванне такія катэгорыі, як *справядлівасць* (народная мудрасць заўсёды на баку добрых набожных людзей), *сумленнасць* (боскую ўзнагароду, шчаслівае жыццё, падарункі лёсу заўсёды атрымліваюць героі, якія ў любых абставінах дзейнічаюць, прытрымліваючыся маральных нормаў і прынцыпаў), *годнасць, сціпласць, праўдалюбства*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, большасць выяўленых у творах Яна Баршчэўскага аксіялагічных дамінант відавочна маюць духоўны характар, што абумоўлена ўплывам хрысціянскіх пастулатаў як на творчасць самога пісьменніка, так і на фальклорны матэрыял, які лёг у аснову многіх твораў, паколькі хрысціянства ў свой час аказала моцнае ўздзеянне на тое, як складваўся беларускі этнас, на фарміраванне культурнага асяроддзя, яго каштоўнаснага зместу.

1. *Арутюнов, С. А.* Народы и культуры. Развитие и взаимодействие / С. А. Арутюнов. – М.: Наука, 1989. – 247 с.

2. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

3. *Бромлей, Ю. В.* Очерки теории этноса / Ю. В. Бромлей. – М.: Наука, 1983. – 412 с.

4. *Игнатович, П. Г.* Этнические основания культуры / П. Г. Игнатович, Ю. В. Чернявская. – Минск: Технопринт, 2001. – 99 с.

5. *Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

6. *Чернявская, Ю. В.* Этническая культурология: концепты, подходы, гипотезы / Ю. В. Чернявская. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – 263 с.

7. *Чернявская, Ю. В.* Этнокультурная самоидентификация белорусского народа: автореф. дис. … канд. культурологии / Ю. В. Чернявская. – Минск, 2002. – 19 с.

*U. ZHILKO*

**THE AXIOLOGICAL DOMINANTS OF THE ETHNIC CULTURE
OF THE BELARUSIANS IN THE CREATIVE WORK
OF JAN BARSCHEUSKY**

This article is devoted to the analysis of the axiological dominants of the Belarusian's' ethnic culture, identified in the creative work of Jan Barscheusky. Christian character of the majority of value categories is marked. It is connected with the direct influence of the Christianity on the identity of the author as the subject of the ethnic culture, on the formation of the cultural environment of the Belarusian ethnos and the value content of the ethnic culture in general.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 07.04.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ